**СУСТРЭЧЫ**

# РАДКОМ ПАЭЗІІ І ПЕСНЯЙ

**У Цэнтральнай бібліятэцы горада Баранавічы выступіла член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэса Таццяна Яцук.**

Творчая сустрэча Таццяны Мікалаеўны Яцук, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэата мноства літаратурных прэмій рэгіянальнага і рэспубліканскага ўзроўню, аўтара 11 паэтычных зборнікаў, кіраўніка аматарскага літаратурна-творчага аб’яднання «Купальскія зоры» пры цэнтральнай бібліятэцы г. Баранавічы, вядомага і паважанага жыхара горада адбылася 16 мая ў дзяржаўнай установе культуры.



Аўдыторыю для творцы склалі студэнты-філолагі Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Важны ўклад у творчы дыялог з сучаснай моладдзю ўнесла член літаратурна-творчага аб’яднання «Купальскія зоры», таленавітая спявачка Галіна Бабонава, якая выканала некалькі песень на словы Таццяны Мікалаеўны.

Галоўнай тэмай паэтычнай размовы з аўтарам сталі падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Таццяна Яцук падарыла прысутным сапраўднае свята інтэлекту, духоўнасці і патрыятызму. Імгненні сустрэчы з айчынным мастацтвам засталіся ў памяці і ў сэрцах яе ўдзельнікаў назаўсёды.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**Гродзенскае абласное аддзяленне**

**На фота:** падчас творчай сустрэчы Таццяны Яцук. Цэнтральная бібліятэка горада Баранавічы, 16 мая 2025 года.

Пазнаёміцца з персанальнай старонкай паэтэсы Таццяны Яцук можна **тут**.


ПАМЯТЬ И БОЛЬ
ПОКОЛЕНИЙ






ПАМЯТЬ И БОЛЬ
ПОКОЛЕНИЙ








ПАМЯТЬ И БОЛЬ


ПАМЯТЬ